# ДАКУМЕНТЫ ЗАХАВАННЯ МІРУ

## У чым сутнасць Ваеннай дактрыны і Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі

**Дэлегаты Усебеларускага народнага сходу выказалі свае меркаванні наконт прадстаўленых Ваенных дактрыны і Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі. Людзі розных прафесій, розных поглядаў і інтарэсаў — таму і меркаванні былі розныя, што дазволіла разгледзець гэтыя найважнейшыя дакументы з усіх бакоў.**

Вадзім ГІГІН:

### «Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі — гэта праграма міру»



Фота БелТА.

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Вадзім ГІГІН** заўважыў, што Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі — гэта не толькі асноўны ваенна-палітычны, нават сацыяльна-эканамічны дакумент, але і ідэалагічны. «Канцэпцыя развівае тыя сэнсы, якія былі закладзены ў тэкст Канстытуцыі, што прынялі на рэферэндуме 27 лютага 2022 года. У першую чаргу, гэта зацвярджэнне каштоўнаснай асновы нашага грамадства. Вось тыя самыя стратэгічныя нацыянальныя інтарэсы — гэта і ёсць пастулаты, якія павінны складаць базіс ідэалогіі беларускай дзяржавы: абарона традыцыйных каштоўнасцяў, адстойванне гістарычнай праўды, патрыятычнае выхаванне, пераемнасць пакаленняў. Гэта ўсё тое, што складае непасрэдна паняцце ідэалогіі як сістэмы ідэй і поглядаў», — сказаў Вадзім Гігін.

Адначасова дакумент дае гарантыі развіцця асобаснага патэнцыялу грамадзян, жыццядзейнасці кожнага, адзначыў дэпутат. «Чырвонай ніткай праз увесь тэкст праходзіць прыярытэт незалежнасці, суверэнітэту і самабытнасці айчыннай палітычнай сістэмы», — падкрэсліў парламентарый.

Вадзім Гігін назваў Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі праграмай міру: «У ёй няма ніякіх мілітарысцкіх палажэнняў, поўнасцю адсутнічае лязганне зброяй ці пагроза ў чыйсьці бок. І гэта выгадна адрознівае і нашу Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, і Ваенную дактрыну ад таго, што прымаюць у краінах НАТА». Парламентарый падкрэсліў, што Беларусь была і застаецца донарам міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі. «А дасягнуць гэтага стану магчыма толькі пры наяўнасці ўнутранай згуртаванасці, умацавання народнай згоды і абароны нашых традыцыйных каштоўнасцяў», — падкрэсліў Вадзім Гігін.

Мікалай БУЗІН:

### «Беларусь не прымае сілавога дыктату і заўсёды гатова да дыялогу»

**Старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Палаты прадстаўнікоў Мікалай БУЗІН** у сваім выступленні звярнуў увагу, што цяпер планета ўвайшла ў гарачую стадыю пераўладкавання свету. «Гэта вядзе да росту колькасці і інтэнсіўнасці ўзброеных канфліктаў, трансфармацыі міждзяржаўнага процідзеяння і ўзрастання значнасці ваеннай сілы», — сказаў ён. Па словах парламентарыя, не выклікае сумнення, што ў перспектыве ўзровень ваеннай небяспекі не зменшыцца. А таму Беларусь будзе вымушана адстойваць свой суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць. Менавіта для гэта і адпрацоўваецца Ваенная дактрына. Мікалай Бузін падкрэсліў, што дакумент не прадугледжвае кардынальных змяненняў палажэнняў ваеннай палітыкі дзяржавы, захоўвае міралюбівую рыторыку і абарончую накіраванасць. «Яна разглядаецца як сістэма поглядаў на падтрыманне міжнароднага міру і бяспекі, забеспячэнне ваеннай бяспекі дзяржавы, — сказаў ён. — Па сутнасці, абноўленая Ваенная дактрына расстаўляе ўсё на свае месцы і гаворыць нармальнай мовай аб тых працэсах, якія адбываюцца ў свеце. У дакуменце вызначаны знешнія і ўнутраныя ваенныя небяспекі для нашай краіны. Асобны акцэнт зроблены на спробах асобных дзяржаў і кааліцый забяспечыць сваё лідарства шляхам гібрыдных войн, рэалізацыі сцэнарыяў каляровых рэвалюцый, прымяненнем сіл і правакаваннем унутраных узброеных канфліктаў. Мы ўсё гэта бачым на ўласным досведзе».

Мікалай Бузін зазначыў, што Дактрына падкрэслівае, што Беларусь гатова з усімі без выключэння краінамі свету будаваць адносіны на аснове ўзаемнага даверу і мірнага суіснавання. Ён назваў Ваенную дактрыну дакументам захавання міру, а не эскалацыі насілля і вайны. «Беларусь заяўляе, што не прымае сілавога дыктату, але заўсёды адкрыта да раўнапраўнага дыялогу. Не мае ні да кога прэтэнзій, але гатова абараняць уласны суверэнітэт і выбраны народам шлях развіцця. Менавіта ў гэтым сутнасць абноўленай Ваеннай дактрыны», — падкрэсліў ён.

Алена ГІРОН:

### «Беларусы, як ніхто іншы, ведаюць каштоўнасць міру»



Фота БелТА.

**Дырэктар Браслаўскай гімназіі Алена ГІРОН** з трыбуны Усебеларускага народнага сходу выступіла ад імя ўсіх жанчын і маці Беларусі. Яна падкрэсліла, што за апошнія гады беларусы прывыклі да міру, спакою, стабільнасці. Аднак, па яе словах, сітуацыя вакол нашых граніц, мілітарысцкая рыторыка заходніх краін прымушае людзей усё часцей успамінаць такое паняцце, як «знешнія пагрозы», і абмяркоўваць, ці будзе вайна. Алена Гірон упэўнена, што ўсё гэта павысіла запыты грамадства на забеспячэнне бяспекі, захаванне незалежнасці і суверэнітэту.

«Я маці сына, які марыць аб ваеннай прафесіі. Мы, маці, давяраем арміі самае дарагое, што ў нас ёсць, — нашых дзяцей. Канешне, мы разумеем, што служба ў арміі звязана з рызыкай для жыцця. У той жа час, мы спакойныя, мы адчуваем падтрымку дзяржавы, мы ўпэўнены, што нашы хвалявнні будуць пачуты. Аб гэтым сведчыць пераемнасць Ваеннай дактрыны, міралюбнасць ваеннай палітыкі нашай краіны», — сказала Алена Гірон.

Алег БАРАНАЎ:

### «Новыя палажэнні Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі навукова абгрунтаваныя»

**Акадэмік-сакратар Аддзялення біялагічных навук НАН Беларусі Алег БАРАНАЎ** падкрэсліў, што новыя палажэнні Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі маюць дакладнае навуковае абгрунтаванне. Асобна ён адзначыў важнасць і своечасовасць уключэння ў Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі новых палажэнняў, якія гарантуюць біялагічную бяспеку. «Час, які прайшоў пасля пандэміі каранавіруса, выявіў новыя факты ў дачыненні да крыніц і ўзбуджальнікаў асабліва небяспечных вірусных інфекцый, выпрабаванні біялагічнай зброі на тэрыторыі сумежных краін з выкарыстаннем розных відаў патагенных мікраарганізмаў, а таксама насякомых у якасці іх пераносчыкаў. Нават звычайныя камары пасля іх спецыяльнай апрацоўкі здольныя распаўсюджваць розныя віды інфекцыйных захворванняў. Усё гэта толькі пацвердзіла правільнасць і своечасовасць прынятых намі мер», — падкрэсліў ён. Пры гэтым, акрамя ўвядзення ў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі новай сферы, з улікам павышэння значнасці біялагічных рызык і выклікаў дадаткова была распрацавана і галіновая Канцэпцыя нацыянальнай сістэмы забеспячэння біялагічнай бяспекі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ЗАКЛЮЧНАЕ СЛОВА ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ, СТАРШЫНІ УНС АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ НА ЗАКРЫЦЦІ ПАСЯДЖЭННЯ VII УСЕБЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ

Паважаныя дэлегаты VII Усебеларускага народнага сходу!

Паважаныя замежныя госці!

Нашы запрошаныя!

Дарагія суайчыннікі!

Мы разгледзелі сёння ўсе пытанні, уключаныя ў наш парадак дня. Кажуць, першы блін заўсёды камяком. Ну, ён не зусім камяком атрымаўся. Будзем лічыць, што мы яшчэ вяршыні ў нашай рабоце не дасягнулі. Абяцаю, што дасягнём. Завяршылася работа першага пасяджэння VII Усебеларускага народнага сходу, сфарміраванага ў новым канстытуцыйным статусе. У летапіс дзяржаўнага будаўніцтва ўпісана новая старонка.

Я сёння паспеў паглядзець нашы сродкі масавай інфармацыі. Можа, не прынята Прэзідэнту цытаваць сваіх падначаленых, але, тым не менш, мне запомнілася звычайная, можа быць, нават банальная, але вельмі дакладная фраза, сказаная кіраўніком нашага Першага нацыянальнага канала Іванам Эйсмантам: «Вялікае бачыцца на адлегласці». Не спрабуйце сёння ацаніць сваю работу, нашу работу. Давайце трошкі пачакаем, і потым мы ацэнім пачатак таго вялікага шляху, які мы маем намер з вамі прайсці.

Мы, народ Беларусі, зыходзячы з адказнасці за сучаснасць і будучыню краіны, жадаючы забяспечыць мір і згоду, дабрабыт нашых грамадзян, непахіснасць народаўладдзя, незалежнасць і працвітанне нашай Беларусі, прынялі дакументы стратэгічнага планавання — Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі і Ваенную дактрыну нашай дзяржавы. У гэтых дакументах нашы памкненні і спадзяванні, беларускі шлях у сучасным вельмі небяспечным і неспакойным свеце.

У дні работы УНС мы заклалі прававы падмурак нашай бяспекі. Гэта залог выканання жаданняў мільёнаў беларусаў.

Упэўнены, прынятыя рашэнні паслужаць трывалай асновай для захавання беларускага народа як унікальнай гістарычнай супольнасці і прымнажэння нацыянальнага багацця, створанага цэлымі пакаленнямі.

Але адных рашэнняў недастаткова. Наперадзе самае галоўнае — карпатлівая праца. І тут я хачу зберагчы вас ад раўнадушша і абыякавасці, пра якія я казаў. Бо быць дэлегатам УНС — гэта, у першую чаргу, несці адказнасць за лёс краіны, выступаць барометрам грамадскіх настрояў, быць прынцыповым у абароне нацыянальных інтарэсаў.

Усім нам трэба даць справаздачу аб сваёй рабоце, далажыць тым, хто вас дэлегаваў, па ўсіх пытаннях, якія разглядаліся на Усебеларускім народным сходзе. Данесці да кожнага, як важна сёння быць моцнымі, адзінымі і згуртаванымі ў адстойванні інтарэсаў роднай краіны.

Вас дэлегавалі — значыць, вам давяраюць, да нас прыслухоўваюцца. Выкарыстоўвайце гэты давер на карысць росквіту нашай роднай зямлі. Умацоўвайце свой аўтарытэт справамі, падтрымлівайце ініцыятывы людзей, дапамагайце ім аб'ядноўвацца для гэтага.

І памятайце: наша веча, Усебеларускі народны сход, не падмяняе дзяржаўныя органы і не ўмешваецца ў іх дзейнасць!

Усебеларускі народны сход, вядома ж, — палітычны інстытут. Як многія з вас учора адзначылі ў сваім інтэрв'ю ў СМІ: гэта тая пляцоўка, на якой прысутнічаюць усе: ад звычайнага, простага вяскоўца, рабочага каля станка да кіраўніка дзяржавы, дзе мы павінны абмяркоўваць галоўныя стратэгічныя пытанні і арыентаваць наша грамадства, якім шляхам ісці і развівацца.

Нельга дапусціць, каб УНС ператвараўся ў бюракратычны апарат. Людзям трэба данесці, што ў кампетэнцыі УНС выключна глабальныя пытанні, стратэгія — як будзем жыць далей, як будзем развівацца, на якіх каштоўнасцях выхоўваць дзяцей і будаваць нашы грамадскія адносіны. Пытанні штодзённасці, будаўніцтва дамоў, рамонт дарог, дахаў, платоў былі і застануцца ў кампетэнцыі ўсёй вертыкалі органаў улады. Але і мы ж вочы не будзем на іх закрываць, вы, дэлегаты, у тым ліку. Але ў любых справах, у вялікіх і малых, нам усім неабходна кіравацца нацыянальнымі інтарэсамі, вырашаць задачы па-дзяржаўнаму, не дапускаць кан'юнктурных падыходаў. Мы будзем сапраўдным нацыянальным франтам. Яго крыху, гэты тэрмін, спаганілі, але гэта сапраўды будзе так.

*(Апладысменты ў зале.)*

Мы павінны, нягледзячы ні на што, быць вышэй за асабістыя амбіцыі і часам за бягучыя абставіны. Наша задача — абараніць суверэнітэт і незалежнасць нашай Радзімы. Мы павінны захаваць краіну, забяспечыць яе шчаслівую будучыню.

Больш за нас гэта ніхто не зробіць, бо час выбраў нас!

Аб'яўляю першае пасяджэнне VII Усебеларускага народнага сходу закрытым.

*(Гучыць Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь.)*